**Бельскі, П**. Пасланец ветэранаў / П. Бельскі // Ленінская іскра (Сянно). — 1990. — 3 лют. — С. 2.

## ПАСЛАНЕЦ ВЕТЭРАНАЎ

Удзельнікі пленума раённага савета ветэранаў вайны і працы вылучылі кандыдатам у народныя дэпутаты Сенненскага раённага Савета па Назаранкаўскай выбарчай акрузе № 7 Сяргея Іванавіча Дзябольскага.

Чым жа заслужыў ён давер ветэранаў?

Нарадзіўся Сяргей Іванавіч у 1957 годзе. Дзяцінства яго прайшло ў Краснадоне, дзе кожны камень памятае аб гераічных справах маладагвардзейцаў. Закончыў сярэднюю школу. Камсамольскі білет уручала ў школе маці Алега Кашавога. Паважалі ў школе Сяргея за стараннасць у вучобе, дружбу і ўзаемавыручку, любоў да спорту, мэтанакіраванасць.

– Пасля атрымання атэстата сталасці, – гаворыць Сяргей Іванавіч, – для мяне не ўзнікла пытанне кім быць. Прафесія афіцэра стала ў нашай сям'і традыцыйнай. Мой бацька Іван Федасеевіч – палітработнік, артылерыст, пачаў вайну ў Брэсце, удзельнічаў у абароне Масквы, ва ўзяцці Кенігсберга. Узнагароджаны двума ордэнамі Айчыннай вайны, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі. Цяпер ён пенсіянер, жыве ў Краснадоне.

Маёй марай была прафесія афіцэра. І яна збылася. Вытрымаў экзамен і паступіў у Кіеўскае вышэйшае агульнавайсковае вучылішча імя М. В. Фрунзе, дзе атрымаў выдатную загартоўку. А потым служба афіцэра-дэсантніка.

Лёс распарадзіўся так, што вайсковай часці, у якой служыў афіцэр Сяргей Іванавіч Дзябольскі, давялося выконваць свій інтэрнацыянальны абавязак у Афганістане.

Знаходзяцца і такія воіны, якія з трыньканнем на гітарах апяваюць свой сумны і горкі лёс. С. І. Дзябольскі не з такіх. Справа аб правамернасці ўводу савецкіх войск у Афганістан – кампетэнцыя ўрада. А салдаты і афіцэры, выконвалі там інтэрнацыянальны абавязак, былі вернымі прысязе, загадам камандавання, праяўлялі мужнасць, адвагу і воінскае майстэрства.

Баёў на рахунку афіцэра Дзябольскага і яго сяброў было шмат. Вось толькі некаторыя эпізоды. Афганскім пагранічнікам стала вядома: праціўніку, які хаваецца ў гарах, дастаўляецца зброя з тэрыторыі Пакістана. Групу савецкіх воінаў, пад камандаваннем афіцэра Дзябольскага, даставілі ў пагранічны раён з такім разлікам, каб перакрыць дарогі, па якіх хутчэй за ўсё пойдзе транспарт. Начны бой здавалася рашыў пастаўленую задачу, але ж надта мала зброі было захоплена. Інтуіцыя падказала камандзіру, што гэта не той транспарт. Душманскія разведчыкі, напэўна данеслі сваім гаспадарам аб знішчэнні машыны і адыходзе савецкіх воінаў. Камандзір групы прымае рашэнне з надыходам цемры зноў зрабіць засаду на ранейшым месцы.

Шум рухавікоў раздаўся глыбокай ноччу. Трапнымі выстрэламі галоўная і замыкаючыя машыны былі выведзены са строю. Кулямётчык доўгай чаргой прашыб сярэдні грузавік. Уцалеўшыя бандыты, хаваючыся за каменнямі, адкрылі агонь. Бой прыняў зацяжны характар. Душманы адважна супраціўляліся. Раніцай пры падтрымцы выкліканых нашых верталётаў удалося іх знішчыць. У ліку захопленай зброі аказалася пяць скрыняў з пераноснымі зенітнымі ракетнымі комплексамі навейшай мадыфікацыі.

Дэсантнікі ў разведцы.

Ноч. Рэха даносіць шум рухавіка. Бачны промні фар.

– К бою! – дае камандуе Дзябольскі. З-за павароту паказалася крытая брызентам машына. Падпусціўшы яе бліжэй, дэсантнікі адкрылі агонь, вывелі рухавік са строю. Супраціўленне, выскакваючых з кузава душманаў, было непрацяглым.

Сяргей Іванавіч Дзябольскі двойчы быў паранены, лячыўся ў шпіталі. За выкананне інтэрнацыянальнага абавязку ён узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі.

У 1987 годзе Сяргей Іванавіч быў накіраваны на працу ў Сенненскі райваенкамат. З такой жа энергіяй ён працуе на даручаным участку. Узначальвае секцыю воінаў-інтэрнацыяналістаў раёна, праяўляе клопаты аб іх, выбраны членам прэзідыума раённага савета ветэранаў вайны і працы.

Які ж наказ далі ветэраны свайму пасланцу? Трымаць цесную сувязь з выбаршчыкамі, жыць іх інтарэсамі. Чула адносіцца да прапаноў, клапаціцца аб ветэранах вайны і працы, воінах-інтэрнацыяналістах, ветэранах Узброеных Сіл.

Несумненна, будучы выбраны народным дэпутатам райсавета, маёр Дзябольскі справіцца з такімі абавязкамі.

**П. Бельскі**,

карэспандэнт газеты «Ленінская іскра»